# ПЕНСІЯНЕРЫ ПАД ПРЫЦЭЛАМ ЗЛАЧЫНЦАЎ

**На паўночны ўсход ад сталічнага гадзіннікавага завода размясціўся самы першы вялікі жылы мікрараён горада. Амаль усе дамы там пабудаваны ў пачатку 60-х гадоў. Гэтая асаблівасць наклала свой адбітак на дэмаграфічны складнік: цяпер у тых дамах жыве вельмі шмат пенсіянераў. А гэта, у сваю чаргу, значна ўплывае на спецыфіку работы міліцыянераў грамадскага пункту аховы правапарадку №81, які месціцца амаль у цэнтры мікрараёна.**


У камунальнай кватэры.

Ды і дыслакацыя яго незвычайная. У хрушчоўцы, якая прытулілася сярод сабе падобных у двары, дагэтуль захаваліся камунальныя кватэры, якія апявалі яшчэ незабыўныя Ільф і Пятроў. Шэсць сем'яў тут карыстаюцца агульнай кухняй і санвузлом. Як гэты рудымент пачатку 60-х дацягнуў да нашых часоў, калі ў Мінску ўжо пачалі зносіць васьміпавярховыя... 

У дзень, калі карэспандэнт «Звязды» завітаў у пункт аховы правапарадку, там працавалі два ўчастковыя міліцыянеры. Службу яны нясуць даўно, ужо больш за сямнаццаць гадоў. У кабінеце маёра міліцыі Аляксандра Амосава сабрана цікавая калекцыя паліцэйскіх шэўронаў з розных краін свету. Вока чапляе экспанаты з Манголіі, і са Швейцарыі, і з Расіі... Але болей за ўсё экспанатаў — з ЗША. Форма паліцэйскіх у кожным штаце мае свае знакі адрознення. І калі звычайна мы яе бачым толькі ў заакіянскіх баевіках, то тут выпала рэдкая магчымасць пагладзець ужывую.

— Збіраю калекцыю больш за дзесяць гадоў. Працэс марудны з-за таго, што заказваць узоры давodзіцца з-за мяжы, адрозніваюцца і кошты ў розных прадаўцоў, якія раскіданы па ўсім інтэрнэце. Затое калі прыходзіць пасылка з чарговым шэўронам, адчуваеш, што высілкі былі не марныя, — усміхаецца Аляксандр Амосаў.

Спецыфіка раёна, дзе знаходзіцца пункт аховы правапарадку, моцна ўплывае на методыку работы ўчастковых інспектараў. Напрыклад, тут знаходзіцца вядомы ў пэўных колах грамадства пункт прыёму шклатары, куды вязуць пустыя бутэлькі са значнай часткі горада. Шклатару ў асноўным здаюць асобы без пэўнага месца жыхарства, аматары алкаголю і пенсіянеры, якія могуць пацярпець ад прадстаўнікоў першых двух сацыяльных слаёў з-за таго, што тым не хопіць на чарговую бутэльку. Таму вельмі часта міліцыянеры патрулююць гэтае месца.

— Акрамя таго, людзі сталага ўзросту, як правіла, атрымліваюць пенсіі на пошце, — гаворыць **старшы ўчастковы інспектар, маёр міліцыі Аляксей БАРБАРЧУК.** — І гэтай старой завядзёнкай, на жаль, карыстаюцца злачынцы. Пасля таго як пенсіянер выйшаў за дзверы пошты, яны падыходзяць да яго, пачынаюць гутарку, якая на першы погляд здаецца бяскрыўднай. Напрыклад, прапаноўваюць размяняць буйныя купюры. Робяць гэта нахрапіста, імкнучыся спачатку забалбатаць старога, а пасля яго перакanаць. У пенсіянера рэакцыя, на жаль, ужо далёка не тая, як у маладых, і таму ён на веру ўспрымае даволі шмат. Таму лепш за ўсё не ўступаць у дыскусіі ні з кім незнаёмым. А супрацоўнікаў банка і пошты мы просім сачыць у памяшканні за тым, ці назірае хтосьці за чалавекам, які атрымлівае ў касе грошы. І калі такое падазрэнне ўзнікае, то раім або паведамляць непасрэдна старым, або адразу нам.

**У кабінеце маёра міліцыі Аляксандра Амосава сабрана цікавая калекцыя паліцэйскіх шэўронаў з розных краін свету.**

Таксама на падман пенсіянераў разлічваюць махляры з гандлярскім прыкрыццём. Напрыклад, патэлефанавалі старому дадому і прапанавалі набыць расхвалены набор каструль. Пры гэтым спачатку называецца кошт, узяты з галавы, — скажам, тысяча рублёў. І як толькі чалавек усвядоміў гэтую велічыню і сабраўся адмаўляцца, яму пачынаюць расказваць пра тое, што ў яго ёсць велізарны шанц атрымаць зніжку — скажам, набыць тавар за паўцаны. Узрадаваны пенсіянер пагаджаецца сустрэцца. Аглядвае тавар, думае, што яму прываліла шчасце, і... аддае свае грошы. Ды вось толькі праз некаторы час даведваецца, што ў рэальнасці яму прэзентавалі не дарагія каструлі знакамітага еўрапейскага брэнда, а танны кітайскі набор адпаведнай якасці, якому ўся цана — рубель сто ў лепшым выпадку. Міліцыянеры таксама згадваюць выпадак, калі нейкая цыганка прадала бабулі вязаную жакетку за мільён недэнамінаваных рублёў! Увяла чалавека ў зман, што гэта нейкая асаблівая воўна, што ледзь не манахі ўручную яе ткалі...

— Махляры — цудоўныя псіхолагі і цудоўна ведаюць, што многія старыя пакутуюць на дэфіцыт гутаркі, — запэўнівае Аляксей Барбарчук. — Так і трапляюць ім у рукі грошы, адкладзеныя на «чорны дзень». А паколькі гэта высвятляецца, як правіла, не адразу, то і затрымаць злачынцу па гарачых слядах становіцца значна складаней.

## «У прафілакторыі я працую, а дома адпачываю...»

Цярпяць старыя людзі і ад сваіх дарослых дзяцей. Пэўная іх частка даўно забылася, што такое рэгулярная праца, але не забывае рэгулярна прыкладацца да бутэлькі са спіртным. Жыве, як правіла, на пенсію маці. Пастаянна ў такіх кватэрах адбываюцца дэбошы, скандалы, за адмову даць грошы на чарговую выпіўку ў адрас старога чалавека ляцяць зняважкі, лаянка. Калі пра гэта стала вядома ўпершыню, то мы выпiсваў афіцыйна папярэджваем пра тое, што калі ён не зменіць свае паводзіны, то адказваць яму давядзецца перад законам. І пасля ўжо не атрымаецца націснуць на жаль і сказаць, што, маўляў, я не ведаў, выбачайце...

На падначаленай міліцыянерам тэрыторыі жыве своеасаблівы рэкардсмен. Назавём яго Л. Ён нарадзіўся ў 1977 годзе. За 39 гадоў жыцця яго ўжо адпраўлялі ў лячэбна-працоўны прафілакторый за парушэнні закона ў нецвярозым стане... дзевяць разоў! Аднойчы ён паехаў у чарговую гадавую «камандзіроўку» менш чым праз тры месяцы пасля таго, як вярнуўся дадому. Нідзе не працуе, жыве на пенсію маці, якой ужо далёка за 60.

— Л. неаднаразова атрымліваў папярэджанні, яго паставілі на прафілактычны ўлік, у тым ліку і ў наркалага. Адпраўлялі яго і пад адміністрацыйны арышт за дробныя правапарушэнні. Мы з ім неаднаразова гутарылі на гэтую тэму: такія паводзіны чалавека здаровай логіцы не паддаюцца. Але Л. заявіў нам прамым тэкстам: «У прафілакторыі я працую, а сюды прыязджаю на адпачынак».

## «Канфлікты нараджае скучанасць»

Участковыя міліцыянеры перыядычна абыходзяць старых, якія жывуць адны. Гэта робіцца для таго, каб праінструктаваць людзей, як не стаць ахвярай злачынцы. Акрамя таго, людзі ў пагонах аглядаюць агульны стан жылля. Калі патрэбная якая-небудзь дапамога ад сацыяльнай службы ці ад камунальшчыкаў, то яны гатовы выслухаць і перанакіраваць просьбу па адрасе.

Зазіраю ў план-заданне па абыходзе. Дзіўнае супадзенне: якраз у тым доме, дзе знаходзіцца пункт аховы правапарадку, значыцца шмат адрасоў, дзе старыя жывуць адны.

На вуліцы прыкмячаю, што многія пад'езды расчыненыя насцеж. Зразумела, што гэта зроблена для вентыляцыі — усё ж такі на вуліцы ртутны слупок штурмуе трыццацігадусную адзнаку, — але тады які сэнс ад дамафона? Усё ж збольшага дзверы пад'ездаў зачыненыя на замок. Міліцыянеры набралі патрэбную кватэру, прагучалі тры-чатыры званкі — і адразу ж пачуўся гук дамафона, які сведчыць аб тым, што праход вольны. А калі б на месцы міліцыянераў апынуліся нейкія прайдзісветы?

Заходзім разам з супрацоўнікамі міліцыі ў агульны калідор камунальнай кватэры. Цеснавата: плячыстаму чалавеку тут развярнуцца няпроста. І налева-направа толькі старыя пашарпаныя дзверы. А ў паветры лунае нейкі рэзкі пах...

— Гэтая скучанасць нараджае шмат канфліктаў. Нам тэлефануюць перыядычна з рознымі скаргамі, якія могуць падацца неспрактыкаванаму чалавеку дзіўнымі, — расказвае Аляксандр Амосаў. — Напрыклад, сусед не закрыў ваду. Ці, напрыклад, нехта па чарзе не памыў падлогу. І вось даводзіцца цярпліва тлумачыць заяўніку, што сам па сабе незакрыты кран — гэта не правапарушэнне, і мы не займаемся яго прафілактыкай. Такія вось псіхалагічныя трэнінгі атрымліваюцца. І тут для нас самае галоўнае — не перагарэць з-за гэтага, не пачаць ставіцца да праблем чалавека па нейкім шаблоне...

**За 39 гадоў жыцця яго ўжо адпраўлялі ў лячэбна-працоўны прафілакторый за парушэнні закона ў нецвярозым стане... дзевяць разоў! Аднойчы ён паехаў у чарговую гадавую «камандзіроўку» менш чым праз тры месяцы пасля таго, як вярнуўся дадому. Нідзе не працуе, жыве на пенсію маці, якой ужо далёка за 60.**

У розных пакоях камунальнай кватэры жывуць адразу два старыя. Міліцыянеры распытваюць іх па чарзе пра здароўе, пра ўмовы жыцця, ці не крыўдзіць іх хто. На апошняе пытанне адказ чуецца адмоўны. Участковыя расказваюць ім пра тое, як не трапіць на вудачку махляра. Пакідаюць памятку, каб старыя азнаёміліся з інфармацыяй падрабязней. І нагадваюць: калі, крый божа, што адбудзецца, каб звярталіся ў апорны пункт.

Многіх старых у іншых кватэрах дома не аказалася. І не дзіўна: на вуліцы стаіць спякота, мала хто захоча па сваёй волі сядзець у чатырох сценах у такое надвор'е. Але гэта не азначае, што іх пакінуць без увагі. Проста міліцыянеры завітаюць да іх у госці крыху пазней. Не сакрэт: любое злачынства куды лепш папярэдзіць, чым пасля займацца яго разборам...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*


Пенсіянеры ўважліва слухаюць парады міліцыі.

## Навіны 102

### ФУТБАЛІСТЫ «ПРАДАЛІ» МАТЧ?

**Супрацоўнікі міліцыі затрымалі гульцоў футбольнага клуба «Ашмяны», якіх падазраюць у подкупе і наўмысным пройгрышы.**




Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС расказалі, што 5 чэрвеня двое грамадзян Украіны праз пасярэдніка падкупілі некалькі гульцоў «Ашмян», каманды першай лігі. Мэта — пройгрыш гэтай каманды ў матчы з «Баранавічамі». Паядынак адбыўся ў гэты ж дзень.

Сума сумнёўнага ганарару, перададзенага футбалістам напярэдадні сустрэчы і адразу пасля яе завяршэння, склала 2 тысячы долараў. Падазраванымі ўжо прызнаны пяць футбалістаў «Ашмян». Што цікава, замешаны ў гэтай нячыстай справе не толькі гульцы асновы, але і тыя, хто ўвесь матч правёў на лаве запасных. Адзін з такіх футбалістаў, перадаваў умоўныя сігналы сваім хаўруснікам наўпрост з лаўкі.

Паводле матэрыялаў Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй, Следчы камітэт ужо завёў крымінальную справу. Усе мерапрыемствы ажыццяўляюцца ва ўзаемадзеянні МУС і футбольнай федэрацыі.

Нагадаем, што раней за ўдзел у дагаворным матчы затрымалі некалькіх футбалістаў сталічнай каманды «Прамень», якая таксама выступае ў першай лізе.

### ЗРАБІЎ НАРКАЛАБАРАТОРЫЮ Ў ІНТЭРНАЦЕ

**Супрацоўнікі Чыгуначнага РУУС Віцебска падчас вышуковых мерапрыемстваў выявілі ў адным з жылых памяшканняў горада больш як 50 кустоў канапель.**

Як высветлілася, уся расада, а яшчэ спецыяльнае абсталяванне і 3 грамы высушанай марыхуаны належалі мясцоваму беспрацоўнаму жыхару, які культываваў траўку наўпрост у пакоі. У дачыненні да мужчыны ўжо заведзена крымінальная справа за незаконнае абарачэнне наркатыкаў.

### ПАТРУЛЁЎ СТАНЕ БОЛЬШ

**На выхадных супрацоўнікі ДАІ будуць несці ўзмоцнены рэжым службы**

Як паведамілі ў Дзяржаўтаінспекцыі, супрацоўнікі дарожнай міліцыі арыентаваны на аказанне дапамогі ўдзельнікам дарожнага руху, стварэнне бяспечных умоў руху, спыненне грубых парушэнняў ПДР. Акрамя таго, нарады ДАІ таксама будуць працаваць у месцах масавага адпачынку і каля аздараўленчых лагераў.

Да 31 ліпеня Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць акцыю «Спынім бяду разам!». Калі вы бачыце, што нецвярозы чалавек рухаецца па праезжай частцы альбо сядае за руль, абавязкова тэлефануйце па нумары 102. Ваш выклік можа спыніць бяду.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*